Кошт паштовай перасылкі
аплачана агулам.

Цана асобнага нумару 6000 м. п.

ВОЛЬНЫ СЬЦЯГ

Адрэс рэдакцыі і адміністрацыі: Вільня, Віленская вул. 12, п. 6. (Wileńska 12 m. 6). Рэдакцыя адчынена ад 12 да 2 г. штодня апрача сьвяточных дзён. Адміністрацыя ад 9 да 3 г.

Выходзіць тры разы у тыдзень.
Падпіска на адзін месяц з дастаўкай да хаты 70.000 м. п.
Для заграніцы удвая даражэй.

Няпрынятыя у друк рукапісы назад не вяртаюцца. Аплата надрукованага залежыць ад Рэдакцыі. Цана абвестак: перад тэкстам 10000 мк., сярод тэксту 9000 м. і на 4 стр. 8000 м., за радок пэтыту у 1 шпальт.

№ 19. Вільня, Пятніца, 12-га кастрычніка 1923 г. Год І.

Аб тактыцы у Сойме.

Сойм ізноў сабраўся ў Варшаве.

Аб скліканьні Сойму ўжо цэлы месяц ішла барацьба „лявіцы“ з „правіцай“. Левыя, занепакоеныя трывожнымі чуткамі аб падгатоўцы правымі дзяржаўнага перавароту, а такжа ўсё узрастаючым фінансавым крызісам, дамагаліся, каб Сойм быў экстранна скліканы яшчэ ў мінулым месяцу верасьню. І хаця чуткі аб пераварацэ, як узьняліся, так і спыніліся, хаця „правіца“ пачалі вінаваціць у падгатоўцы перавароту.. „лявіцу“, аднак, за апошні месяц у польскай дзяржаўнай палітыцы і ўва ўсім жыцьці гаспадарства было гэтулькі варожых здарэньняў, гэтулькі палітычных няўдач, што пачатая соймавая сэсія напэўна будзе вельмі гарачая.

„Усе інстынктыўна прачуваюць, што гэтая парляманцкая восень будзе мець рашучае значэньне для далейшага разьвіцьця ў нас адносінаў ува ўсіх галінах жыцьця“, — пісаў напярэдадні адкрыцьця сэсіі „Kurjer Polski“.

І гэта праўда: трэба спадзявацца, што на соймавым грунце ўзьнімецца нязвычайна вострая партыйная барацьба, запаведзь якое прадстаўляе інтэрпэляцыя (запрос) паслоў трох клюбаў лявіцы (—тэкст яе друкуецца ніжэй). Барацьба гэтая давядзе або *да разьбіцьця ўрадовае большасьці ў Сойме*, бо і сярод апошняе дасьпявае пераканаьне аб немагчымасьці зацягіваньня ўтварыўшагася палажэньня ў гаспадарстве, або *да роспуску Сойму*, калі ён—дзякуючы партыйнай барацьбе—аканчальна ўтраціць здольнасьць да творчае працы. Аб трэцім „або“: магчымасьці *захвату ўлады „лявіцай“*, гаварыць ня будзем, бо ў гэта ня верым; лішне ўжо бязьдзейная, расклябаная гэная польская „лявіца“, дый пан Тугут зусім шчыра прызнаўся, што яна не рвецца да ўлады...

Мы ўжо ня раз на гэтым месцы адзначалі, што, як ня бачым мы дабра для беларускага насяленьня ад панаваньня „правіцы“, так ня бачылі яго і ад усіх урадаў „лявіцы“, якая ўжо *мела* ў сваіх руках уладу, ды *не ўмела яе ўдзяржаць*. З гэтае прычыны нашым дэпутатам ў Сойме трэба дужа асьцярожна аднясьціся да таго ці іншага вырашэньня пытаньня, *якую пазіцыю павінен заняць Беларускі Пасольскі Клюб у барацьбе партыяў у Сойме?*

Пытаньне гэтае вельмі цесна зьвязана з другім—больш глыбокім—пытаньнем. Гэта—*пытаньне аб становішчы беларускага прадстаўніцтва ў варшаўскім Сойме наагул.*

На зьезьдзе прадстаўнікоў арганізаванага беларускага грамадзянства з усіх паветаў Заходняе Беларусі, што адбыўся ўраз-жа пасьля выбараў у Сойм і Сэнат — год таму назад, гэтае пытаньне разглядалася вельмі сур'ёзна і ўсестаронна. Тады быў высказаны пагляд, што беларускія пасьлы павінны заняць у Сойме пазіцыю *безадказнае апазіцыі*,—значыць, ня прымаць учасьця ў тварэньні ўлады і ў адказнасьці за ўрадавую палітыку, а толькі бараніць з соймавае трыбуны інтарэсы выбраўшага іх насяленьня і праводзіць законы, адпавядаючыя выбарнай плятформе Цэнтральнага Беларускага Выбарнага Камітэту. Але аднача сна з гэтым зьезд даў наказ паслом шукаць паразуменьня з польскай дэмакратыяй у справах сацыяльнае палітыкі і ў барацьбе з рэакцыяй. Апошні наказ пасьлы, відаць, зразумелі лішне шырака: яны, ламаючы першы і зышоўшы з становішча безадказнае апазіцыі, прынялі ўчасьце ў выбарах прэзыдэнта і сваім галасаваньнем высказалі даверые польскай дэмакратыі ня толькі ў справах сацыяльнае, але і *агульнае* палітыкі. Так сама зыйшлі нашы пасьлы з становішча безадказнае апазіцыі, калі галасавалі за ўрад генарала Сікорскага, веручы ў яго „лявіцовасьць“ і ў яго... сумленнасьць у выпаўненьні дадзеных забавязаньняў. А вынікі такое тактыкі аказаліся, як ведама, дужа сумнымі для нашага народу....

Вось-жа наш пасольскі клюб павінен надалей *ня выходзіць з свайго прынцыповага становішча*, не даваць *нічога напавер* ні „лявіцы“, ні „правіцы“, ды толькі тады мяшацца ў справы барацьбы польскіх партыяў за ўладу, калі ад гэтага можа быць *бясспрэчная, пэўная карысьць для беларусаў.*

Апошняе—самае труднае. І мы, разумеючы гэта, заклікаем наш Пасольскі Клюб *да найвялікшае асьцярожнасьці і развагі, да самае цеснае еднасьці з выбаршчыкамі і грамадзянствам*, бо кожны абмылковы крок у сучасны рашучы мамэнт можа нязвычайна цяжка адбіцца на долі нашага народу пад панаваньнем Польшчы.

Лаўрыновіч.

Паварот сярод сялянства.

Прыглядаючыся да сучаснага жыцьця нашага беларуса-селяніна, адразу кідаецца ў вочы рэзкая перамена ў яго настроях. Апошні год не прайшоў дарма і пакінуў па сабе заметныя сьляды.

Леташнія выбары ў Сойм і Сэнат Польскай Рэспублікі ўскалыхнулі нашае сялянства, нарадзілі надзеі на папраўленьне ягонага жыцьця, на задаваленьне ягоных неадкладных патрэбаў: урэгуляваньня зямельнага пытаньня, адбудовы зруйнаваных вайной гаспадарак, школы ў роднай мове, і людзкіх адносінаў да сябе з боку мясцовай адміністрацыі. Сяляне з вялікім зацікаўленьнем аднясьліся да выбараў і аддалі свае галасы за свой беларускі сьпісак, а менш нацыянальна-сьвядомыя—за найболей суліўшую ім польскую партыю „Wyzwolenie“. Верылі, што выбраўшы сваіх паслоў, якія голасна заявяць аб іх крыўдах і патрэбах, знойдуць послух і спачуцьцё сярод польскага грамадзянства і ўраду, што новы Сойм задаволіць іхнія патрэбы і залечыць балячкі.

З усіх бакоў напływаўшыя да рэдакцыі карэспандэнцыі, паведамляючы аб зьдзеках і крыўдах з боку паноў-абшарнікаў і адміністрацыі, канчаліся надзеяй на Сойм. „Вось, выбралі сваіх паслоў, можа, там зробяць штось-ці ў Сойме, будзе родная школа, надзеляць зямлёю, дапамогуць адбудавацца, прагоняць нягодную адміністрацыю і ўсё будзе добра“ — так больш-менш думаў кожны селянін. „Там, за Бугам ёсьць канстытуцыя, пэўна-ж і да нас хутка прыдзе“—пісаў іншы. Верылі, што стварыўшыяся немагчымыя варункі зьяўляюцца вынікамі ненармальнага паваеннага палажэньня і што, пераходзячы да нармальнага дзяржаўнага будаўніцтва, Польская Дзяржава забясьпечыць ім грамадзянскія правы, прыме пад увагу іхныя патрэбы. У пісьмах і гутарках цікавіліся соймавай працай, чакалі вынікаў гэтай працы...

Але йшлі месяцы. Беларускія пасьлы выпаўнілі свой абавязак перад сваімі выбаршчыкамі, голасна заявілі аб жудаснай долі нашага селяніна, пачулі аб гэтым і польскі ўрад, і польскае грамадзянства, і ўвесь сьвет... Але напрасна. Голас іх астаўся голасам клічучага ў пустыні. Ня толькі польскія эндэцка-абшарніцкія партыі, але і польская дэмакратыя—тыя самыя вызваленцы, якія так шмат далі абяцанак нашаму селяніну, каб засесьці на пасольскіх лаўках, маючы ўладу ў сваіх руках, падтрымліваючы ўрад Сікорскага,—нічога не зрабілі, каб палепшыць жыцьцё беларускага селяніна.

Пасыпаліся новыя скорпіоны: ні роднай школы, ні зямлі, ні дапамогі на адбудову, ні перамены адносінаў з боку адміністрацыі, якая бачыла ў нашым селяніне толькі „bydle“, „bolszewika“, „bandyta“, гной для польскае культуры і матар'ял для вызыску пана-абшарніка.

І селянін-беларус зразумеў, што яму нечага спадзявацца ад сучаснага польскага Сойму, нечага нават спадзявацца ад польскай дэмакратыі і тых партыяў, якія прыкідаюцца ягонымі прыяцелямі і дэмагогічнымі пасуламі хочуць захаваць ягонае даверые. Зразумеў, што нашы беларускія пасьлы ў сучасных варунках бязьсільны дабіцца ў Сойме задаваленьня сялянскіх патрэбаў...

Гэтае горкае расчараваньне, гэтыя разьбітыя надзеі нашага сялянства бязумоўна прынясуць яму вялікую карысьць. Сярод яго йдзе новы працэс паглыбленьня клясавай і нацыянальнай сьвядомасьці, больш крытычных адносінаў да сучаснасьці і ўмацаваньня таго пераконаньня, што толькі ўласнымі сіламі можна паправіць сваё жыцьцё, уласнымі сіламі трэба будаваць сваю родную хату. Ён ужо пазбавіўся гэтай шкоднай веры, што дапамога прыйдзе аднекуль з боку, што хтось-ці зразумее ягоныя патрэбы і задаволіць іх. На ўласныя сілы ён можа толькі лічыць і, калі сам ня возьмецца за працу, за будову гмаху свайго вызваленьня,—яму ніхто чужы не дапаможа.

Першая частка труднага шляху пройдзена; досьлед, праўда, куплены вялікаю цаною, але тым большыя карысьці ён прынясе. Нашае сялянства павінна прайсьці і другую частку гэтага цярністага шляху: трэба распачаць цяжкую працу арганізацыі і ўмацаваньня сваіх сілаў, гэтая чорная штодзенная праца праўда ня дасьць адразу вялікіх эфэктаў, вынікі яе выявяцца ў будучыне, але чым скарэй і мацней будзе йсьці арганізацыйная праца, тым хутчэй дасьць пажаданыя вынікі, прыблізіць сьветлую будучыну.

Наша інтэлігенцыя, а перадусім вясковая, якая бліжэй за усіх стаіць да селяніна і ведае ўсе яго патрэбы, павінна ўзяць на сябе кіраўніцтва гэтай працай. Цяжкое гэта заданьне: мала таго, што гэткі інтэлігент наражаецца на ўсялякія рэпрэсіі і правакацыі з боку „крэсовых кацыкаў“ і абшарніцтва, ён на першых парах можа спаткацца і з інэртнасьцю і недаверыем і з боку самога сялянства, што ў шмат разоў больш балюча адчуваецца, чым перашкоды з боку нашых ворагаў. Але ня трэба падаць духам, верачы, што пляновая няўхільная праца дасьць урэшце пажаданыя вынікі.

На гэта трэба зьвярнуць асаблівую увагу і нашым паслом у Сойме і ўзяць на сябе агульнае кіраўніцтва гэтай працай. Трэба адкінуць шкодныя ілюзіі, што пры сучасных варунках можна дабіцца нейкіх рэальных карысьцяў на соймавым грунце, і выкарыстаць час на пашырэньне клясавае і нацыянальнае сьвядомасьці сярод сялянства, на арганізацыю сялянскіх масаў, апіраючыся на якія самі-ж пасьлы будуць мець больш шансаў на тое, што з голасам іх прымушаны будуць лічыцца.

Я. Л.

Пішыце да нас аб жыцьці-быцьці вёскі, аб сваіх ворагах і прыяцелях. Хай кожны падпішчык „Вольнага Сьцягу“ будзе і яго супрацоўнікам.

Да прадваеннага „парытэту“.

Міністар Кернік аб унутраным стане Польшчы.

Экспозэ мін. Керніка, зробленае прадстаўніком прэсы, мае для ўсяго грамадзянства, а асабліва для нас беларусаў, жыхароў „Крэсаў“, аграмадную, зусім асаблівую важнасьць.

Міністэрства ўнутраных спраў, як ведама, задае тон усей унутранай палітыцы ўраду. Усе найбольш балючыя пытаньні, якія грызуць і трывожаць усіх грамадзян Польшчы, а асабліва яе пазбаўленых правоў—„грамадзян другога сорту“, якімі больш за ўсіх зьяўляюцца беларусы, усе вырашаюцца ў гэтым міністэрстве.

І новы міністар, трэба аддаць яму справядлівасьць, досыць адкрыта, відаць, моцна апіраючыся на „stałą większość narodową“ у Сойме, паказаў, чаго трэба спадзявацца ад яго грамадзянству, між іншым нашым „Крэсам“.

Як відаць з экспозэ п. Керніка, сучасны ўрад пачаў грунтоўную і вялікую працу па пэратварэньню ўсяго вялізарнага гаспадарственага апарату „палітычнай адміністрацыі“, якая перад усім іншым мае зусім выразную задачу ўмацаваць уладу сучаснага правіцовага габінэту—цэлай сыстэмай добра-ведамых нам з прадваеннага досьледу мераў і спосабаў рэакцыі...

У гэтую ўсёахопліваючую рэформу ўваходзіць—і правядзеньне новых, „лепшых“ законаў, і арганізацыя „добрых“ уладаў і ўстановаў, і падбор адпаведна „добрых“ выпаўніцеляў дырэктываў хьена-пястоўскага цэнтру на мясцох.

Гаворачы аб гэтых новых законах, „прадбачаных Канстытуцыяй“, п. Кернік зусім шчыра... не гавора, што яны будуць згодны з Канстытуцыяй...

Паміж імі ёсьць такія важныя, як закон аб сабраньнях і саюзах, аб дзяржаўнай і ўрадовай мове, аб пашпартох, аб прэсе, аб дзяржаўнай паліцыі, і ўрэшце—зусім ужо пярэчучы Канстытуцыі законапраект аб... вынятковых станах (даўнія расейскія „ўсіленныя, чрезвычайныя і т. п. охраны“)...

Тая праца, якая ўжо ідзе поўным ходам „po zespoleniu i uzgodnieniu“ усіх уладаў на мясцох, ужо ўстрывожыла прагрэсыўнае польскае грамадзянства, бо гэта значыць ня больш ня менш, як ведамае нам добра па расейскім часам падчыненьне ўплывам рэакцыйнай палітыцы мін. ўнутр. спраў усіх уладаў і ўстановаў на мясцох... Пан Кернік супакойвае грамадзянства аб гэтым. Ён кажа, што „самастойнасьць напр., школьных уладаў“ ня будзе, „ня можа быць зьменшанай“: аб усім будзе вырашаць мін. прасьветы, толькі... старосты і ваяводы будуць „выражаць сваю опінію ў справах пэрсанальных“... Гэта значыць, што праз мясцовую паліцыю і адміністрацыю п. Кернік будзе сьлядзіць за „политической благонадежностью“ пэдагогаў, як гэта было ў царскай Расеі...

Надзвычайна важнай для нас, жыхароў „Крэсаў“, справай увядзеньня самаўрадаў таксама заняўся пан міністар,—хутка будуць унесены ў Сойм законы аб самаўпраўленьні гміны, павету, гараду і ваяводзтва. Аб характары гэтых законапраектаў п. Кернік ня кажа нічога, але ў прэсе ўжо паявіліся весткі аб тым, якія галоўныя мэты і задачы маюць гэтыя законы, прынамсі для нашых „Крэсаў“. У прадапошнім № віленскага „Słowa“ перадаецца са слоў асобы, „добра інфармаванай“, што „няма ніякага страху, каб польскасьць нашай зямлі мела — дзеля дэмакратычных глупстваў—плаціцца такім адрачэньнем ад сваіх надзеяў, якім было-б увядзеньне... беларускай нацыянальнай курыі (асобных сьпіскаў) у выбарах да самаўрадаў“...

Што гэта значыць, ясна кожнаму...

Як і можна было думаць, галоўную ўвагу мін. унутр. спр. зьвяртае на паліцыю.

Рэформа паліцыі мае мэтаю стварыць такі скованы „сьціслай“ ваеннай дысцыплінай спраўны орган у руках старостаў і ваяводаў, які-б зусім гарантаваў цантральны ўрад ад усялякіх неспадзяванак, асабліва небясьпечных цяпер у часе дарагоўлі і агульнага абурэньня насяленьня, іменна ў адносінах да сучаснага ўраду...

П. Кернік робіць нашым „Крэсам Усходнім“ камплімэнт: „stan bezpieczeństwa“ папраўіўся на‘т на „Крэсах Усходніх“, якія дагэтуль маглі будзіць найвялікшы непакой, „хронічныя“ дагэтуль напады цяпер амаль што спыніліся...

Але-ж, як гэта ня дзіўна і як гэта ня йдзе ў разрэз з тэй стасаванай усюды ў іншых установах дзяржаўнай адміністрацыі па загаду мін. фінансаў Кухарскага ашчаднасьці п. Кернік тут-жа сьцьвярджае, што стан паліцыі на „Крэсах“ — нявыстарчаючы—вымагае ён... павялічэньня штатаў.... Як-жа гэта пагодзіць—відавочную паправу „stanu bezpieczeństwa“ на Крэсах і... канечнасьць павялічэньня на іх паліцыі... — Можа за шмат ужо папраўіўся?... Далей яшчэ дзіўней: толькі што зусім „спыненая“ дзеяльнасьць бандаў, аказываецца—у тым мейсцы, дзе матывуецца неабходнасьць павялічэньня паліцыі,—ізноў ажывае... „Банды“, „zasycane“ з заграніцы ўрадам Ластоўскага, ня толькі падтрымліваюцца мясцовым насяленьнем, але і імкнуцца прыняць формы палітычныя—сепаратычныя“—(адарваньня Беларусі ад Польшчы)...

Дзеля таго — паміма ашчаднасьці „трэба павялічыць паліцыю на Крэсах!...“

Прадбачацца нават вялікія выдаткі: пастройкі кашараў для паліцыі і забесьпячэньне яе патрэбаў.

Цікаўныя таксама паведамленьні міністра аб цераробленым ім для унясеньня ў Сойм праекце закону аб прэсе, апрацованага яшчэ ген. Сікорскім.

П. Кернік кажа, галоўная падстава законапраекту ў тым, што „прэса павінна служыць państwu“... Можна адказаць яму, што прэса павінна служыць сваім ідэалам — праўды, справядлівасьці, дабра і г. д..., і што „państwo“ таксама павінна імкнуцца да тых жа найвышэйшых мэтаў, што państwo часта забываецца аб іх,—тады прэса павінна не „служыць“ гэткаму „państwu“, але вучыць яго самога служыць гэтым ідэалам... У гэтым і зьмяшчаецца ўсё абаснаваньне вольнасьці прэсы... Але калі п. мін. Кернік гавора аб „вольнасьці“, якую па яго закону, будзе мець прэса, якая будзе „на службе“ państwa, дык можна зразумець, што кроецца ў гэтым яго законе.—І запраўды—ён ужо адкрыў трохі адзін бок гэтай „падлягаючай толькі суду„ „вольнасьці“, калі сказаў, што „пэўнай навасьцяй у законе ёсьць абавязак“ ня выпускаць выданьня з друкарні, пакуль адміністрацыя... не скарыстае з свайго „права“ канфіскацыі... А пасьля — „толькі рашэньне Суда...—гэта праз паўгода ці год!...

„Сучасны ўрад, завярае пан міністар—спэцыяльна нашую газэту, ня стасаваў прэсовых рэпрэсіяў...

„У верасьні толькі было іх... 144“, кажа двума радкамі ніжэй той самы пан. Мін. Кернік... — у тым ліку каля пяці было і нашых канфіскатаў...

„Спакой, лад і парадак у грамадзянстве—утрыманы“, кажа п. міністар.—Забастоўкі ня мелі пасьпеху і ўпалі. Асталася адна толькі... дарагоўля, якая пр… чыняе найбольш клопатаў...міністэрству ўнутр. спра… (не аправізацыі!?)... і—„акцыя камуністаў“...

У канцы п. мін. Кернік гавора штось неяк глу… аб нейкіх „замахах“ з абодвых бакоў, якія тол… „умацуюць раўнавагу ў гаспадарстве“, але гэта—зу… незразумела...

Гэтае экспозэ хіена-пястоўскага міністра паві… зусім адчыніць вочы ўсім.

Зусім ясна, да якога парадку яскравай і адкр… тай рэакцыі хуткім крокам—вядзе нас ўрад п. Керні… і Вітаса, якія на сваім выбарным штандары паставі… як і P. P. S., — сьцяг польскай лявіцы — з патрэта… Пілсудскага...

Як бачым, гэты „камунікат“ ня столькі—ра… крывае, на сколькі і хавае за агульнымі выраза… цэлую, стройна прадуманую сыстэму, аб запраўдна… мэце якой мы гаварылі спачатку.

Экспозэ, зразумела, павінна было ў прадстаўніко… прэсы вызваць шмат пытаньняў...

Але, як паведамляюць... неправіцовыя газэты… на пасыпаўшыяся на яго пытаньні пан міністар адка… заў агульным адказам; заявіўшы, што ў яго „няма… неадкладных спраў гаспадарсьцьвенай вагі, касяшчы… разьвітацца...

С.

Палітычныя падзеі.

ПОЛЬШЧА.

„Robotnik“ паведамляе, што эндэцкія фашысты… пашыраюць чуткі аб маючым, быццам, адбыцца зама… ху з боку лявіцы, каб адвярнуць увагу ад саміх фа… шыстаў. Хьена-пястоўскі ўрад нібы-то занепакоіўс… гэтымі чуткамі, дэфэнзыва стала сачыць за „замахоў… цамі“, пасыпаліся трывожныя данясеньні аб падры… тоўцы да аружнай акцыі, пушчаны быў у рух увес… шпігоўска-паліцэйскі апарат. Дайшло да таго, шт… пан старшыня міністраў Вітас гаварыў аб замаху, я… аб рэчы, бадай, зусім пэўнай і страшыў ім прадстаў… нікоў урадовай большасьці на нарадзе на прошлы… тыдні.

Каб зрабіць справу больш падобнай да праўды… справа „замаху“ была злучана з справай урадоўцаў… забастоўка якіх павінна была аблягчыць „замах“… быць пачаткам „перавароту“.

Дзеля гэтага распачалася акцыя. Да Варш… былі сьцягнуты войскі. Уся паліцыя была на пагатс… За выдатнейшымі прадстаўнікамі лявіцы пачалі… чыць. На выпадак забастоўкі ўрадоўцаў падрыхтов… былі войскі, каб замяніць урадоўцаў, асабліва на… гунках, тэлефоне і тэлеграфе. Нават быў падрыхта… ны дэкрэт аб прызыве рэзэрвістаў. Усё гэтае ка… вала шмат мільярдаў, абцяжаючы і без таго дрэнн… становішча фінансаў.

8-га кастрычніка, калі нібы-то меўся распачацц… „пераварот“, па Варшаве хадзілі ўсіленыя паліцэйскі… патрулі. Войска было на пагатове. Узброеныя з но… да галавы паліцэйскія рэзэрвы чакалі ўва ўсіх кам… сарыятах. Ратуша была падобна да крэпасьці.

Непакой сярод люднасьці, выкліканы дарагоўля… і спадкам валюты, яшчэ больш павялічыўся, калі па… чалі гаварыць аб пераваротце, калі для падцьверджан… ня чутак пачалі кружыць па Варшаве ўзброень… аддзелы паліцыі і калі паліцыя ў ночы ўрывалася… пякарні і рэквізавала хлеб.

„Два Обсты у аднэй галаве“.

(*Спроба дыягноза нейкае нячуванае хваробы*).

(Гл. „Вольны Сьцяг“ № 18).

І мы ня можем не сказаць, што гэтая супярэчнасьць—нешта зусім зразумелае, натуральнае: абодва Обсты—заходні і ўсходні—як шчырыя, так сказаць зусім *натуральныя* палякі, як клясычна-крэсавыя дзеячы, могуць і маюць права дахадзіць у сваей натуральнай, чыста зоолёгічнай барацьбе з сваім нацыянальным ворагам—кожны ў свайм абмяжованым абшары — да апошніх крэсаў „натуральнасьці“...

Ўсходня-крэсавы Обст можа ня ведаць нават лепш — *не павінен ведаць* аб тым, што на Заходніх Крэсах істнуе *яго ідеолёгічны антыпод*,—заходня-крэсавы Обст.

Паміж імі адлегласьць у колькі градусаў даўгаты...

Абодва Обсты жывуць, так сказаць, „на лоне прыроды“, вядуць чыста натуральную зоолёгічную барацьбу, супольнае паміж імі—іх шчырая „польскасьць“—у сьціслa, зоолёгічным значэньні гэтага выразу.

Мазгі абодвух Обстаў, ня ведаючых адзін аб адным, могуць захаваць ўсю спакойную „мараль“, усю „niezachwianą“, як любіць выражацца віленскі п. Обст, лёгіку *первабытных інстынктаў і апэтытаў*...

Але зусім іншая справа—калі, гэтак кажучы, мазгі ці ідеолёгіі абодвах Обстаў павінны неяк зьмясьціцца ў *аднэй* галаве..., калі і Усходнія і Заходнія Крэсы неяк зьвязываюцца ў нешта *адзінае*, маючае *супольны цэнтр, аб‘яднанае пэўнай* сыстэмай ня толькі супольных установаў, але і супольных паняцьцяў і ідэяў...,—калі і тыя і другія Крэсы са ўсімі сваімі Обстамі апыняюцца ў *адным гаспадарстве*, якое запраўды і зьяўляецца пэўным маральным адзінствам, пэўнай лёгічнай сыстэмай...

Калі, так сказаць, зусім розныя адзін ад аднаго „крэсавыя“ мазгі абодвух натуральна-польскіх Обстаў—заходняга і ўсходняга — віленскага і быдгоскага павінны канешна зьмясьціцца ў якой-небудзь *цэнтральнай галаве*—пасярод іх—скажам у *варшаскай* галаве, якая гэткім чынам атрымлівае, як цяпер кажуць, мандат—кіраваць „Крэсамі“ абодвух Обстаў... заходняга і ўсходняга...

Як кожнаму зразумела, тут ужо ня толькі на шчырай польскасьці і натуральных маралі і лёгіцы інстынктаў і апэтытаў ня выедзеш, але наадварот—іменна гэтая „натуральнасьць“ зьявіцца тут першай і самай забойча-шкоднай перашкодай...

Хай хто-небудзь запраўды выразна ўявіць сабе, як можна ў *аднэй* галаве зьмясьціць абедзьве ўразрэз супярэчныя адна другой, лёгічна забіваючыя адна другую ідэолёгіі і аргумэнтацыі абодвых Обстаў...

Гэтае заданьне для кожнай здаровай, думаючай галавы, зьяўляецца *абсалютна невыпаўнімым*, зьяўляецца, так сказаць, лёгічнай і маральнай „квадратурай круга“...

Вобразна, але можа ня вельмі далікатна (выбачайце, панове Обсты) кажучы, іменна *мазгі абодвух крэсавых Обстаў у Варшаўскім цэнтры кожная, заклiканая да кіраваньня, здаровая галава павінна перад усім выкінуць і растаптаць...* (ausrotten),—бо яны няўхібна *зробяць яе ці дурной ці нездаровай*...

Запраўды, — кожная, як кажуць, арганізаваная аб‘яднаная галава падлягае законам маралі і лёгікі паміж іншым—*закону супярэчнасьці*. — ня можа ніяк зьнясьці істнаваньня ў сябе дзьвюх гэтак пярэчучых ідэолёгіяў.

Істнаваньне апошніх магчыма альбо для галавы зусім прымітыўнай і неарганізаванай маральна і лёгічна, альбо самая гэтая супярэчнасьць зусім *разсадзіць* галаву, *дэзарганізуючы* яе, *аглупіць* яе разумную лёгіку, расьтліць яе маральны сэнс!...

Гэткая апэрацыя пазбавіць такую галаву таго, што называецца „Sensus kommunis“ — „агульным сэнсам“ пазбавіць яго—*супольнага для ўсіх нармальных людзей розуму*!... У такой аглупленай галаве запануе тое, што псыхіятры называюць „Sensus privatus“...

Лацінскі выраз „privatus“ па грэцку будзе „idiotes“...

Адсюль людзей з гэткімі галавамі, у якіх мірна і спакойна жывуць адно побач другога розныя *супярэчныя паняцьці*, якімі ня можна кіравацца ў жыцьці, а тым балей—кіраваць другімі, а ўжо ніякім чынам ня можна кіраваць цэлым вялікім гаспадарствам, завуць „ідыётычнымі“.

Цяпер на адну хвіліну ўявім сабе,—але гэтага запраўднасьці ня можа-ж быць, — што такая гала… якая-б умясьціла ў сабе мазгі абодвых Обстаў—захо… ня-крэсавага і ўсходня-крэсавага—*ня толькі істн*… але нават і *кіруе* якім-небудзь вялікім гаспадарств… а другая такая-ж самая зьяўляецца прадстаўніком… тае-ж дзяржавы—дапусьцім на хвілю зусім немагчым… у Лізе Народаў, ці бароніць свайго кіруючага ўра… калегу ў Гаазкім Трыбунале Справядлівасьці...

Што-ж з гэтага ўсяго вынікне?

Як сябры Лігі Народаў, таксама і судзьдзі ў Т… бунале Справядлівасьці маюць аб гэтай Лізе ці аб г… справядлівасьці *агульна-людзкае* паняцьце і судз… аб ёй паводле „sensus communis“, а такі „паўнамо… міністар нашай фікцыйнай дзяржавы будзе адказв… судзьдзям і сябрам кіручыся сваім асабістым то… аднаму яму на ўсім сьвеце зразумелым „sensus pr… tus“, ці „idiotes“—сваім асабістым інтарэсам.

І на ўсе пазываньні сябраў Лігі ці Гаагі на… ці іншую агульна-людзкую апінію такі „міністар“… шае фікцыйнае дзяржавы будзе ў адказ высоўвац… па чарзе толькі то аднаго то другога — то заход… то ўсходняга крэсавага Обста, не разумеючы нават т… як недарэчна і дзіка, а часам, калі гэта не ка… крыві і сьлёз чалавечных,—дык і сьмешна—адзін О… супярэча другому...

Як кожнаму зразумела, вынікі абароны інтар… такога фікцыйнага гаспадарства гэткім урадам і г… прадстаўніком яго на міжнародным полі будуць са… ганебныя!.. „Ідыётычна“ („прыватна“) падгатава… ідыётычным („прыватным“) урадам запраўдныя інтар… можа, зусім добрага гаспадарства, насялянага м… вельмі шляхэтным народам, будуць няўхібна ідыёты… правалены...

„Sensus privatus“ (по грэцку „idiotes“)—а… гэта—тое самае, што ў старажытнай шляхоцкай П… шчы называлася „prywatą“, тое, што як раз і згу… гэтую Польшчу, разьбіўшы яе на тысячы „крэсаў“… тысячы „Обстаў“—з асобнай, „прыватнай“, па-гр… „ідыётычнай“ лёгікай у галаве кожнага!...

...шчасьце, усё скончылася спакойна і ў Варшаве было ніякіх забурэньняў.

...на з апошняй справаздачай Польскай Краёвай Касы да 30 верасьня ў Польшчы было ...вана 11.197.737.897.342 маркі (адзінаццаць ... сто дзевяцьдзесят сем мільярдаў семсот трыццаць мільёнаў восемсот дзевяцьдзесят сем тысяч ...рак дзьве). У працягу апошніх 10 дзен урад ...ў яшчэ 2.342.292.643.320 марак, г. зн. кожна ...друкаваў на 234.229.264.332 маркі. Цяпер ...яшчэ болей і дзяржаўны доўг усё больш павышаецца. Адначасна ў працягу гэтых 10 дзен за... ...та і срэбра зьменшыліся на 5.824.015 марак ...ных валют на 5.057.548.387 мк.

...пушчаны новыя банкноты па 500.000 мк. польскага банкноты размерам меншыя за дзесяцьтысячна-зялёнага калёру. Банкноты памечаны ...жніўня 1923 г.

...ела-Бельску адбылася протэстацыйная дзьвёхдзённая забастоўка. Забастоўка была агульная. Ні... ...ня не працавала. На адбыўшымся мнагалюдным прынята рэзалюцыя дамагаючаяся адстаўкі ...няснага ўраду.

...усіх капальняк і гутах Горнага Шлёнску ...ся протэстацыйная забастоўка.

... кастрычніка, канфіскаваны газэты „Naprzód“ ... Ludowy“.

НЯМЕЧЧЫНА.

...жаўная Рада большасьцю $^2/_3$ галасоў прыняла ...ект уставы аб паўнамоцтвах для ўраду. Упа... ...Урад распачаць у вобласьці фінансавай, ...ай і сацыяльнай шагі, якія будзе лічыць па... ...і адпаведнымі. Урад можа ў разе патрэбы ...а ад аснаўных законаў дзяржавы. Устава аб ...ах не датыча справы ўрэгуляваньня часу ...нтаў і запамогаў у справах сацыяльнага за... ...я. Урад мае права падаваць загады выда... ...дставе ўставы аб паўнамоцтвах, да ведама ...ту, які можа іх зараз-жа спыніць. Устава ...я важнай з мамэнту яе абвешчаньня, а тра... ...ў мамэнт зваленьня сучаснага ўраду, аднак ...31 сакавіка 1924 г.

...арлямэнце адбылася дыскусія над экспозэ ... Сацыял-дэмакраты заявілі, што хаця маглі-б ...ўныя агаворкі, наагул аднак згаджаюцца з ...і канцлера.

...сонскія газэты паведамляюць, што блёк са... ...кратаў і камуністаў апрацаваў супольную ...дзейнасьці: 1) пляновае назначэньне на ўсе ...пасады рашучых рэспубліканцаў, 2) узбра... ...летарскіх сотняў на выпадак небясьпекі для ..., 3) распачаць меры з мэтай устрыманьня ...крызіcу, 4) абедзьве партыі утвараюць ...онце супольны клюб, 5) арганізацыя асобнага ...для барацьбы са спэкуляцыяй, 6) распачаць ...з іншымі сацыялістычнымі ўрадамі ў спра... ...тай дзейнасьці.

...ад акружнай арганізацыі сацыял-дэмакратаў у ...райшоў надта бурна. Нездавольства з палі... ...у партыі расьце раўналежна з упадкам уплы... ваў партыі сярод масаў. Гільфэрдінг прызнаўся, што сацыял-дэмакратычная прэса знаходзіць усё менш чытачоў. У Тюрынгіі і Саксоніі сацыял-дэмакраты распачалі супольную працу з камуністамі.

Парлямэнт звычайнай большасьцю галасоў выразіў вотум даверыя ўраду Штрэзэмана проціў галасоў нямецкіх нацыяналістаў, баварскай народнай партыі і камуністаў. Прапазіцыя ў справе скасаваньня вынятковага палажэньня адкінута. Праект уставы аб паўнамоцтвах для ўраду парлямэнт не разглядаў дзеля таго, што ня было пэўнасьці ў тым, што праект атрымае патрэбныя $^2/_3$ галасоў.

Вялікія нямецкія прамысłоўцы з Штынэсам на чале, відаць, у паразуменьні з урадам Штрэзэмана распачалі перагаворы з ген. Дэгуттам, камандуючым францускімі акупацыйнымі войскамі, аб узнаўленьні працы ў акупаваных абшарах.

Пасьля адбыўшайся канфэрэнцыі Штынэс ад імя камітэту прамыслоўцаў выслаў да канцлера Штрэзэмана пісьмо, у якім выстаўляе вось якія дамаганьні: 1) зварот канфіскаванага вугальля ад часу акупацыі Руры; 2) зварот падатку ад вугальля за той-жа час; 3) скасаваньня падаткаў на вугальлё для Рурскага абшару; 4) выдача гарантыяў адносна адшкадаваньняў за вугальлё, якое будзе празначана для рэпарацыі; 5) скасаваньне вугальнага камісарыяту і дзяржаўных разьдзяляючых урадаў на акупаваных тэрыторыях; 6) упаважненьне камітэту прамыслоўцаў да ўрэгуляваньня бягучых спраў у паразуменьні з акупацыйнымі ўладамі; 7) упаважненьне камітэту прамыслоўцаў для далейшых перагавораў з ген. Дэгуттам, між іншым у справе утварэньня Т-ва для эксплёатацыі чыгунак у Надрэніі; 8) павялічэньне часу працы ў капальнях да $8^1/_2$ гадз. для работаў пад зямлёю і да 10 гадз. для работаў іншай катэгорыі. Штынэс дамагаецца якнайхутчэйшага адказу на гэтыя дамаганьні.

Адначасна адміністрацыя капальняў Рурскага абшару абвесьціла, што ўводзяцца даваенныя законы ў справе рабочага дня. З гэтай прычыны нямецкі Саюз горных работнікаў выдаў адозву, пратэстуючую проціў павялічэньня рабочага дня.

С. С. Р. Р.

Латвійскае Тэлеграфнае Агенства паведамляе, што ўрад С.С.Р.Р. зьвярнуўся да ўрадаў Латвіі, Літвы і Эстоніі з прапазіцыяй, каб гэтыя дзяржавы ўвайшлі ў Саюз Сацыялістычных Радавых Рэспублік. У выпадку, калі гэтая прапазіцыя балтыцкімі дзяржавамі будзе адкінута, С.С.Р.Р. прымушаны будзе байкатаваць іх, скіроўваючы ўвесь свой загранічны гандаль праз Петраград і Чарнаморскія порты.

Маскоўскія газэты паведамляюць, што здароўе Леніна ўлетку выклікала паважны непакой, аднак у працягу апошніх двух месяцаў на столькі палепшылася, што Ленін пачаў сам хадзіць і нават крыху гаварыць. Дактары ня трацяць надзеі на аканчальнае выздараўленьне.

ЧЭХІЯ.

У суботу ў Празе адбылася канфэрэнцыя прадстаўнікоў усіх чэскіх прафэсыянальных работнікаў горнай прамысловасьці і дэлегатаў уласьнікаў капальняў, на якой дайшло да паразуменьня. Работнікі згадзіліся на зьмяншэньне платы ад 9 проц. да 13 проц. Прадстаўнікі саюзаў пастанавілі закончыць забастоўку і распачаць працу.

...ай „гаспадарсвенай Польшчы“ трэба добра ...ь, што з мешаніны обставых мазгоў можа най... ...ны з сваіх „красах“, ніколі не зробіш для ...аго цэнтру адная наават самаго дрэнага гас... ...венага розуму!...

...ых мазгі, як выказалі мы, хай нават зроб... ...самага *зоолёгічна*-шчырага польскага мата... ...*лёгічна* зьніштажаюць адзін другога, зьніштажэмела і ўвесь той „sensus communis“, які ...зьмест запраўднага розуму. Вось мы здаецца ... прычыну таго дзіўнага зьявішча, аб якім ... пачатку гэтых радкоў.

...эба зразумець, што сваіх „Обстаў“ мае ня... ...авіца, але—у той ці іншай форме і адмене—...

...алі апошняя трымала ўладу, дык „обставізацыя“ мазгоў была зусім ясна сьцьверджаным фак...

...тай дрэннай „обставай хваробы“ для Польшчы два выхады.

...выкінуць зусім з варшаўскай цэнтральнай ...тыя „вадліва-обставыя“ мазгі і, здратаваўшы ...аць па ўсім абшары Рэспублікі запраўды гаспадарскіх мазгоў для яе цэнтру.

...—калі на жаль ня знойдуцца, дык... выкінуць ...к гэта ні горка і крыўдна Обстам, з апош... ...м—і самыя „Красы“—ратуючы сваю варшаўскую і рашту. Польшчы ад гэтага паталёгічнага ...ньня,—ад шкоднай, балючай і сьмешнай хваробы „обставізацыі“ яе мазгоў...

...ба зразумець, што—ці адно ці другое *павінна* ...біць сама Польшча... Бо калі яна сама ня ...ятага, дык за яе можа ня столькі ветліва, як ...робіць гэта—тымі ці іншымі рукамі—*гісторыя*...

Суліма.

З газэт.

„Да Расеі“.

Буржуазія дзяржаваў Антанты, бачучы зусім ужо выразнае імкненьне да аб'яднаньня трох вялікіх, перажыўшых страшныя катастрофы, дзяржаваў: ССРР, Нямеччыны, Японіі,—забіла трывогу.

Трэба гэтаму перашкодзіць за ўсялякую цану! І вось, пачынаюць езьдзіць у ССРР дэлегацыі з Амэрыкі, Англіі і, урэшце, з Францыі, ды ўсё яны „не знаходзяць і сьледу камунізму“ ды заклікаюць свае ўрады завязаць самыя цесныя зносіны з ССРР, каб адцягнуць гэты саюз радавых рэспублік ад аб'яднаньня з Нямеччынай і Японіяй.

Найменш цікавасьці ў кірунку зьбліжэньня з ССРР выяўляла дагэтуль Польшча: урад яе сур'ёзна лічыцца з небясьпекай пераносу ў Польшчу таго камунізму, якога на Усходзе „не знаходзяць“ амэрыканцы і французы.... Але, раз на гэта йдзе Францыя, трэба і Польшчы станавіцца з ёй поплеч. І вось у польскай прэсе пачынаюць раздавацца галасы, якія заклікаюць „ісьці да Расеі“, — толькі-ж, ведама, не дзеля матарыяльных карысьцяў, а—„маральных“! Гэтак, цікава выступленьне даволі консэрватыўнага „Kur. Warsz.“, перадрукаванае ў „Gaz. Warzs.“:

„Нам непатрэбна ніякая Ліга Народаў!“ — казаў Шэйдэман. „Мы павінны ўзмацовываць ненавісьць да ворагаў, гдзе толькі магчыма. Пры матчыных грудзёх, у школе, ў царкве, ў казармах. Нашым клічам павінна быць ненавісьць-ненавісьць і яшчэ раз ненавісьць“.

Гэтак казаў Шэйдэман у маі 1923 году. Гэтыя словы трэба адзначыць, як матарыял дзеля характарыстыкі паваеннае Нямеччыны, якая маніцца вясьці адбудову сваей вялікадзяржаўнай магутнасьці пры помачы ненавісьці.

Далей, ахарактарызаваўшы расейскую душу, газэта піша:

Аднак, Расея патрэбна сьвету, патрэбны яе спажывецкія рынкі, патрэбна яе сыр'ё. Дый для Расеі патрэбны цівілізаваны сьвет, каб несьці да яе сьвятло і знак Крыжа, сымвал любві бліжняга, фізычнае і маральнае аздараўленьне, духовы ратунак для загубленага Расеяй і Нямеччынай насяленьня.

І цывілізаваны сьвет, той, які на штандарах сваей палітыкі піша: „любоў да сябе і да бліжняга“, павінен пайсьці да Расеі, да тае Расеі, найвялікшую віну якое прадстаўляе тое, што яна навучылася сама сябе ненавідзець.

І сьвет пойдзе да Расеі.

Аднак, перад тым трэба аддзяліць яе ад „ідэалаў нямецкае ненавісьці“.

Нямецкая душа, ад якое йдзе ненавісьць, небясьпечна. Расейская душа перадусім хворая, ашалелая.

У імя здаровае будучыны сьвету чым хутчэй будуць зьнішчаны масты з Нямеччыны ў Расею, тым лепей. Каб не дасьпеў працэс „нямецка-расейскае амальгамацыі“, вечны саюз „ненавісьці з інстынктам непраціўленьня злу“.

Голас „Kur. Warzs.“ вельмі характэрны. Але асабліва цікава адзначыць адно: да часу адбудовы Польшчы цэлыя пакаленьні польскага народу ўзгадовываліся ў духу самае непрымірымае ненавісьці да тых, хто падзяліў Польшчу,—перадусім да маскалёў і немцаў. І тыя, што гэную ненавісьць раздзьмухівалі ў вялізарнае полымя, што лічылі яе нацыянальнай цнотай для сябе, цяпер асуджаюць Нямеччыну за тое самае!

Шкода, што польскае грамадзянства не асуджае з такой-жа рашучасьцяй — у адносінах да сябе — ну, хаця-бы калянізацыі беларускіх зямель, дзеля якое служыць узорам дзейнасьць якраз прускае гакаты...

З Польскага Сойму.

9-га кастрычніка адбылося першае паседжаньне Сойму пасьля летніх вакацыяў. Старшыня міністраў Вітас выступіў з прамовай, ў якой абрысаваў сучаснае палажэньне ў Польшчы.

Паслы апазыцыйных клюбаў (P.P.S., Wyzwolenie, група Донбскага) унесьлі інтэрпэляцыю да Старшыні міністраў у справе сітуацыі і агульнай палітыкі ўраду:

„У працягу апошніх месяцаў унутранае палажэньне Польскай Рэспублікі станавілася ўсё больш грозным. Сяньня мы стаімо беспасрэдна перад катастрофай. Нябывала шпаркі спадак маркі ў сувязі з нічым неабмяжованай спэкуляцыяй на дарагоўлі паставіў шырокія масы грамадзянства над пропасьцяй нэндзы, выклікаў усюды ўзрастаючае нездавольства, пагражае істнаванью прамысловасьці. Адусюль чуваць галасы адчаю, панікі і гневу.

Урад ня толькі не працівадзействуе катастрофе, але павялічвае яе дзеля адсутнасьці якога-небудзь пляну ў загадах, уступчывасьці адносна жаданьняў капіталістычных і спэкулянцкіх групаў, спыненьне ўсялякай працы над запраўднай направай фінансаў шляхам адпаведнага ападаткаваньня перадусім маючых клясаў. Дзейнасьць паасобных міністэрстваў, часта лёгкамысная, заўсёды пазбаўленая праграмы, давяла дзяржаўную палітыку да хаосу, які выклікае ў грамадзянстве ўпадак веры ў сябе, фэрмэнт, а часамі проста паніку.

У вобласьці міжнародных адносінаў пасьля запрапашчэньня балтыцкай палітыкі, пасьля гданскіх, расейскіх і літоўскіх неўдачаў, мы атрымалі балючае абніжэньне павагі Рэспублікі ў часе выбараў да Рады Лігі Нацыяў. Усе гэтыя даныя паказваюць, што віну кампрамітацыі нясе выключна непрадбачучая, няздольная палітычная ігра пана міністра заграпічных спраў, тым больш лёгкамысная, што ўласьцівы п. міністру партыйны спосаб працы і „рэарганізацыя“ міністэрства фактычна здэзарганізавалі ўвесь яго апарат.

Міністэрства ўнутраных спраў пашло па лёгкаму шляху рэпрэсіяў проціў апазыцыйнай прэсы, акружыла „апекай“ многіх паслоў і сэнатараў, работніцкіх і народных дзеячоў, пасылаючы за імі агентаў дэфэнзывы, а адначасна пад яго окам спакойна вядуць дзейнасьць т. зв. фашыстаўскія арганізацыі, ідзе яўная агітацыя проціў рэспубліканскага ладу ў дзяржаве, проціў Сойму, проціў падставаў канстытуцыі і агульнага выбарнага права.

Ня толькі няма мовы аб далейшым разьвіцьці работніцкага і зямельнага заканадаўства, але п. міністар працы спыняе выбары да ўрадаў касаў хворых, што відавочна скіравана да ліквідацыі самое інстытуцыі, а ўрад уносіць да Сойму праект уставы, якая на сутнасьці нівечыць усю зямельную рэформу.

Аб праграме ўжо трэцяга ў сучасным габінэце міністра фінансаў зусім нічога ня ведаем. Першыя яго крокі, як таёмныя перагаворы ў кампаніі аслаўленага п. Гамэрлінга з невядомым консорцыюмам аб заграпічнай пазычцы на невядомых варунках, пушчаньне да прэсы оптымістычных, але мала заслугоўваючых на

веру пагалосак, якія не спраўджаюцца, раптоўнае ўстрыманьне прыйма дробных ашчаднасьцяў у злотых—толькі аблягчаюць праступную работу чорнай біржы.

Гвалтоўныя зьмены ў войску, спыненьне шмат якіх спраў распачатых раней, выдаленьне здольных афіцэраў з чыста-партыйных паглядаў, аслабляюць абарону дзяржавы

Адносіны да гаспадарсьцьвеных працаўнікоў, спосаб іх асабістага трактаваньня і трактаваньня іх патрэбаў праз пана старшыню Рады міністраў пагражае разлажэньнем гаспадарсьцьвенай машыны.

Барацьба з спэкуляцыяй ня істнуе. Спэкуляцыя, увераная ў бяскарнасьці, давяла рынак збыту да становішча поўнай анархіі, дзе цэны скачуць з гадзіны на гадзіну, залежна ад капрызу таго ці іншага гуртаўніка ці купца.

Адміністрацыйная палітыка на т. зн. усходніх крэсах з мамэнту абняцьця ўлады ўрадам, які прызнаецца да нацыяналістычнай доктрыны, яшчэ больш абастрыла нацыянальныя адносіны, парадзіла небясьпечны фэрмэнт, даючы шырокае поле для агітацыі расейскіх агентаў і аблягчаючы заданьне бандам, якія ўрываюцца на тэрыторыю Рэспублікі праз дрэнна вартаваную граніцу.

У гэткіх варунках Сойм ня можа захоўвацца пасыўна. Урад адказны перад Соймам, Сойм—перад народам. Розныя заявы сябраў ураду і самога п. старшыні Рады міністраў, то наіўна оптымістычныя, то зноў ні адсюль ні адтуль безнадзейныя, ясна паказваюць, што сучасны габінэт—без праграмы і без даверыя краю ня мае прыва дамагацца ад Сойму, каб той спакойна чакаў далейшага разьвіцьця катастрофы, ані ад апазыцыі, каб яна была нямым сьведкам гэтай катастрофы.

Прыймаючы пад увагу вышэйшае, падпісаныя, кіруючыся цяжкім непакоем аб лёс Рэспублікі і дэмакратыі ў Польшчы, а адначасна пераканаными, што істнуе адзіны шлях выхаду, шлях, якім патрафіць ісьці толькі Урад моцны даверыем працоўных масаў, цьвёрды адносна махінацыяў, што выклікаюць голад людн асьці, умеючы падпарадкаваць інтарэсы маючых слаёў інтарэсам Дзяржавы—пытаюцца пана Старшыні Рады Міністраў, ці мае замер даць справаздачу перад Соймам з палажэньня Рэспублікі, з усей дзейнасьці прадстаўляемага ім ураду“.

Варшава, 7 кастрычніка 1923 г.

Маршалак Сойму паведаміў, што суды дамагаюцца аб выдачы паслоў: Наўмана, Жулаўскага, Надэра, Галкі, Підгірскага, Пірагова, Васыньчука, Дзьмітрука, Чучмая, Макаўкі, Хруцкага, Камарэвіча, Прыступы, Братуня, Паўлюка, Казубскага, Сяргея Казіцкага, Войцюка, Любарскага, Оконя, Квяткоўскага, Рэгера, Барана і Якавюка.

З УСЯЕ БЕЛАРУСІ.

ЗАХОДНЯЯ БЕЛАРУСЬ.

ХРОНІКА.

Стыпэндыі для беларусаў у Чэхіі. Цэнтральная Беларуская Школьная Рада ў Вільні атрымала з Прагі вестку, што ўсе стыпэндыі, вызначаныя чэскім урадам для беларусаў, на гэты год **ужо заняты** выэміграваўшымі беларускімі матурыстамі, для катоых вышэйшая навука ў межах Польшчы аказалася недаступнай.

Беларускі камітэт у гор. Чыкаго сабраў на карысьць бедных сіротаў, якія вучацца ў Радашкоўскай беларускай гімназіі пяцьдзесят пяць доляраў і 85 цэнтаў ахвяр. Грошы гэтыя перасланы праз Ноел Стэйт банк на імя Більдзюкевіча.

8 кастрычніка распачаўся ў Горадзенскім Акружным Судзе працэс проціў групы асобаў, якіх вінавацяць у дзейнасьці „Закордоту“. На лаўцы абвінавачаных 15 асобаў. Справе йдзе пры зачыненых дзьвярах.

У Касе Хворых. 9 кастрычніка адбылося пасяджаньне сябраў Рады Касы Хворых, на якім мелася адбыцца выбары старшыні Рады. Выбары аднак ня далі ніякіх вынікаў. Кандыдат P. P. S. Бэндаровіч атрымаў толькі 19 галасоў левага блёку. Праўадаўцы і хадэкі галасавалі проціў. Такім чынам ніхто абсолютнай большасьці не атрымаў. Рада прызнала выбары старшыні неадбыўшымися і даручыла камісару Касы Хворых зьвярнуцца да Акружнага Ураду апекі над хворымі ў Варшаве з мэтай атрыманьня разьясьненьня адпаведных артыкулаў уставы Касаў Хворых у тым сэнсе, каб выбары старшыні Рады адбываліся простаю большасьцю галасоў, а не абсалютнаю.

Справа „Унзэр Тогу“. 10 кастрычніка Акружны Суд у ўпрошчаным парадку разглядаў справу рэдактара газэты „Унзэр Тог“ Залмана Райзэна, абвінавачанага аб надрукаваньні ў адным з нумароў рэдагаванай праз яго газэты артыкулу, зьневажаючага польскія ўлады, пішучы аб зьдзеках у Віленскім Urzędzie Śledczym. Суд прызнаў Райзэна вінаватым і выгаварыў на 2 тыдні арышту, але на падставе амнэстыі кару зусім скасаваў.

Весткі з вёскі.

М-ка Дзісна.

23 верасьня да нас у Дзісну прыехалі паслы вызваленцы п. п. Адамовіч і Шапель.

Дзеля таго што быў фэст, як заўсёды ў дзень сьв. Тэклі, дык народу сабралося многа: былі каталікі, былі й праваслаўныя, бо наш бацюшка Рафаловіч абвесьціў у царкве, што будзе вызваленскі мітынг. Відаць, паны вызваленцы нападаюць на духавенства толькі на мітынгах, а калі справа йдзе аб помачы, дык не адмовяцца прыняць яе і ад таго-ж самага духавенства, а нашы айцы духоўныя гатовы прыслужыцца каму хочаце, толькі не беларусам,

Але пераходжу да самых пасольскіх прамоваў. Ня ведаю, ці прыгожа паном вызваленскім паслом лгаць, бадай, за гэтае іх можна і да адказнасьці пацягнуць. Я кажу гэта дзеля таго, што пасол Адамовіч, апрача ўсялякіх глупстваў, гаварыў яшчэ шмат няпраўды і брахні, разьлічанай на поўную несьвядомасьць слухачоў. Напрыклад, гэты пан казаў, што пасла Барана арыштавалі за тое, што ён расстрэльваў людзей. Пане посьле! можаце гэта гаварыць там, хто ніколі ня чуў пра Барана, але-ж не забывайце, што на мітынгах бываюць людзі, якія добра знаюць пасла Барана і ўсю ягоную справу. Вы збрахалі, пане пасол, і нават так нікчэмна, як не брахалі нават эндэцкія газэты, апісваючы Беластоцкі працэс.

Другая брахня пра мітынгі беларускіх паслоў кс. А. Станкевіча і П. Мятлы у Празароках і Дзісьне, на якіх я быў прысутны. Вось-жа кс. А. Станкевіч, якраз заклікаў да еднасьці паміж беларусамі праваслаўнымі і каталікамі, а не разьбіваў на два варожыя лягеры, як гэта цьвердзілі вы, пане Адамовіч.

Што датыча, абвешчаньня Беларускага каралеўства (?!), як да чаго, быццам, імкнуцца беларускія паслы, дык хіба толькі вар'ят, альбо чалавек аканчальна ўтраціўшы сумленьне, мог сказаць гэтае, і не дарма штурхнуў вас ў бок ваш калега п. Шапель, бо нават і яму, як відаць, стала брыдка ад вашага лгарства.

Вашымі нападамі на пасла П. Мятлу там, дзе яго ўсе даўно ведаюць, вы, паночак, толькі пашкодзілі самі сабе, бо ўсе зразумелі, што гэтак-жа праўдзіва і ўсе іншае, аб чым вы гаварылі.

Пасьля—раджу вам, пане посьле, падучыцца крыху гісторыі, бо ўся тая лухта, якую вы казалі, даводзіць, што альбо вы зусім ня знаеце гісторыі нашага краю, нават па польскім падручнікам, а мо' вы і тут сьвядома казалі няпраўду цёмным людзям, каб ашукаць іх.

Таксама напрасна хваліліся вы, пане Адамовіч, што вы арыштавалі рэвіровага Манкевіча, бо ён быў арыштаваны зусім па другой прычыне і па іншай справе, а што вы казалі, быццам, дзякуючы вам звольнены з Лукішак Маліноўскі, дык чаму-ж вы йшчэ не сказалі, што дзякуючы вашым-жа захадам звольнены і Атрахімовіч, Мач і інш.

Ня раз я чуў ад нашых паслоў, што адносіны ў Сойме з вызваленцамі добрыя, дзеля таго, што гэта лявіцовая партыя, з якой можна ў шмат якіх пытаньнях згаварыцца, але пачуўшы гэтыя паскудныя напады на нашых паслоў і дзікую брахню, разьлічаную на поўную несьвядомасьць слухачоў, на якую не адважыцца самы заядлы эндэк, я быў страшэнна зьдзіўлены і абураны і лічу патрэбным давясьці гэтае да ведама нашага грамадзянства і нашых паслоў. Праўда гэтыя лгарствы прынясьлі шкоду толькі самім-жа вызваленцам, бо народ ужо ня верыць дэмагогічным выкрыкам паноў з „Wyzwolenia“, ды й ашукаць яго рознымі лгарствамі ня так ужо лёгка. Праходзіць той час, калі можна было лавіць рыбку ў мутнай вадзе, панове Адамовічы і Шапелі.

Куля.

Пацаўская гміна, Слонімскага пав.

Сучасныя парадкі ў нашай гміне, якія ляглі ўсім сваім цяжарам на плечы нашага беднага народу, вымагаюць колькі слоў напісаць аб іх. Такіх парадкаў, як кажуць старыя людзі, такога рабунку яшчэ ніколі ня было. Тыя бязьмерныя падаткі ды даніны, якія мы плацім за паноў і другіх (ды яшчэ, каб і зборшчыку асталося на бутэльку) выціскаюць з нас апошні сок. А тут яшчэ фурманачная гонка. Гэта праўдзівая кара для нашага сялянства. Пры добрых парадках можна было-бы абыйсьціся і без яе. Напрыклад: пану войту з дому да гміны ня болей, як паўвярсты ходу. Гэтую „вялікую“ дарогу можна было бы і прайсьці, але на што: Па прыказу прыедзе ці Сымон, ці Янка, ды яшчэ з добрым канём і кур'ерам даставіць пана войта. Чаго ўжо мы не рабілі, каб пазбавіцца гэтае возкі. Памятуючы, што „не падмажаш—не паедзеш“, рабілі і гэта, але памагло, як кашаль у хваробе. Цяпер, мусіць „і падмажаш і то скрыпець будзе“. Нарэшце войт Канюшкевіч загадаў солтысам сабраць па пяць тысячаў марак з каня. Гэта яшчэ было ў прошлым годзе, калі марка што-небудзь каштавала. Народ абрадаваўся. Думалі, што ўжо спакойна можна будзе працаваць на сваіх шнурках. Дык дзе там. Праз два тыдні ў вёску Яварская Руда зьявіўся паліцыянт з прыказам да солтыса даць фурманку ў Слонім. Трэба было выпаўніць, бо паліцэйскі бізун, каб не адскочыў солтыс, добра сьцебануў-бы. З таго часу возім і да цяпер. Ці так сама: сабралі па дваццаць тысячаў на будоўлю мосту праз раку Шчару але ні грошаў, ні мосту і да цяперашняга дня ніхто ня бачыў і не пабачыць мусіць.

Н. Жальба.

УСХОДНЯЯ БЕЛАРУСЬ.

З Менску.

К збору с.-г. падатку. Падатковай камісіяй пры Ц.В.К. Беларусі разгледжана пытаньне аб зборы грашовай часткі сельска-гаспадарчага падатку.

У адносінах да гэтага пытаньня Беларусь падзелена на 3 раёны.

У першы раён уваходзіць Менскі і Барысаўскі паветы, для якіх аплата грашовай часткі падатку [illegible] іць вышэй ад другіх паветаў.

У другі раён уваходзяць Бабруйскі і Мазырскі паветы і ў 3 раён—Ігуменскі і Слуцкі.

Пачатак заняткаў у Белар. Дзярж. Універсытэце. З 20 верасьня пачалося выкладаньне лекцыяў на ўсіх факультэтах Беларускага Дзяржаўнага Універсытэту.

Пераробка бульбы. Галоўнае Упраўленьне Сав. Гаспадаркамі пускае ў гэтым годзе 8 крахмальных заводаў для пераробкі бульбы са сваіх гаспадарак, а таксама і тых лішкаў бульбы, якія будуць у сялян.

Апрача гэтага ў будучым годзе будуць пушчаны яшчэ 4 крахмальныя заводы.

Беларускі культурны рух на Смаленшчыне.

У канцы жніўня і ў пачатку верасьня ў Смаленскай губэрскай цэнтральнай бібліятэцы адбылася выстаўка беларускага друку — тых кніг і часопісаў, якія з вялікімі цяжкасьцямі былі сабраны Беларускай губэрскай сэкцыяй. Выстаўка дала смалянам шмат цікавага, бо большая частка з іх дагэтуль ня ведала, што ў беларусаў ёсьць кніжкі ў беларускай мове і нават такія, як гісторыя, геаграфія, задачнік і інш.

Пасьля выстаўкі аб'явілася шмат жадаючых чытаць што-небудзь беларускае, асабліва гэта прыкметна сярод моладзі. Але на вялікі жаль, Белсэкцыя [illegible] што нічога ня мае апрача тых кніжак, якія атрымала [illegible]ёю для школаў. Тая жменька кніжак, якая была на выстаўцы, часова па просьбе загадчыка бібліятэкі пакінута ў бібліятэцы. Белсэкцыя даўно ўжо клапоціцца аб наладжаньні пры бібліятэцы беларускага [illegible] але не сустракае ў гэтым дапамогі ад належных органаў. Таксама да Белсэкцыі зьвярталіся аб высылцы беларускіх кніжак на Смаленскі вакзал, дзе чуецца іх патрэбнасьць, але й тут сэкцыя нічога зрабіць не можа. Хто ў гэтым вінават?

Гэтак дзеецца ў краёвым цэнтры—Смаленску, як стаіць справа ў павятовым месьце, на вёсцы?

Праца Белсекцыі адбываецца ў вельмі ненармальных варунках. Ад 1-га мая сэкцыя лічыцца зачыненай згодна з пастановаю калегіі Смаленскага губаддзелу народнай асьветы. Беларускае Цэнтральнае Бюро пры Н. К. [illegible] С.С.Р.Р. запрапанавала працы не спыняць да вырашэньня справы ў цэнтры, і вось ужо пяць месяцаў як гэтая справа вырашаецца і ніяк ня можа вырашыцца. Усе распараджэньні цэнтру тут у Смаленску выпаўняюцца вельмі туга. Каб зваліць з сябе віну за зачыненьне сэкцыі, Смал. губ. А.Н.А. разаслаў запытаньне па ўсіх павятовых аддзелах, ці хочуць беларусы Смаленшчыны мець беларускія школы? Адказ адзін — „ня хочуць, бо на Смаленшчыне беларусаў няма“. А ўсё залежыць ад таго, хто і як падыходзіць да селяніна.

Не зважаючы на сваё фармальнае зачыненьне, сэкцыя працуе—выпаўніла камандыроўкі ў вышэйшыя навуковыя ўстановы, пасылала настаўнікаў на беларускія курсы ў Менск і вядзе штодзённую малапрыкметную, але ўпартую працу.

М. Агейчык.

Рэдактар-Выдавец Я. Лагіновіч.

Друкарня Левін і Сын, Вільня, Нямецкая 2[illegible]